вампир, а вампиром – «язык», особая сущность, с помощью которой вампир может читать мысли других.

Трансформация образов связана, в первую очередь, с постмодернистской тенденцией к деконструкции уже существующих образов, причем чаще всего в сторону их антропоморфизации, причем наблюдается не только увеличение степени очеловечивания антропоморфных персонажей, но и антропоморфизация зооморфных (например, образа Дракона (Змея)). Изначально тенденция к антиантропоморфизации (зооморфизации) персонажей имела негативную семантику и часто выступала как маркер деградации человека. Затем в XXI в. произошла смена семантики с отрицательной на положительную, что, вероятно, связано, согласно мнению И. Морозова («Феномен куклы в традиционной и современной культуре»), с востребованностью у читателей фэнтези нового типа персонажа, «человека будущего», обладающего как интеллектуальными, так и физическими сверхспособностями и даже бессмертием.

**Библиографические ссылки**


1. Аливердиев А. Баба Яга // Звездная дорога. Красногорск, 2000. № 12. С. 131–140.
2. Антонов С. А. Тонкая красная линия. Заметки о вампирической парадигме в западной литературе и культуре // Гость Дракулы и другие истории о вампирах. Антология. Санкт-Петербург : Азбука-классика, 2009. С. 5–86.
3. Лукьяненко С. В. Ночной дозор. Фантаст. роман. Лукьяненко С. В., Васильев В. Н. Дневной дозор : Фантаст. роман. М. : ООО «Издательство АСТ», 2003. 762 с.
4. Пелевин В. О. Ампир V. М. : Эксмо, 2010. 416 с.



**Анцімонік А. В. (Мінск)**


## Асноўныя аспекты рэалізацыі феномена кахання як праявы экзістэнцыі ў паэзіі маладой генерацыі сучаснай беларускай літаратуры

У аксіялагічнай сістэме паэтаў маладога пакалення (паняцце «малады» тут умоўнае, слаба звязанае з фізічным узростам) [1, с. 45–46] каханне займае адну з галоўных пазіцый. Звязаная з гэтым феноменам паэтыка інтымнай і філасофскай лірыкі аўтараў (у артыкуле – В. Жыбуль, Зм. Вішнёў, А. Хадановіч, В. Трэнас, В. Рыжкоў, В. Гапеева, Ц. Велет, В. Морт, Н. Кудасава, Ю. Цімафеева), як правіла, вылучаецца дамінаваннем выразнага драматычнага пафасу. З уласцівым маладосці максімалізмам творцы схільныя надзяляць больш увагі эсхаталагічным матывам, спалучаным са з'явай кахання, чым вітальным. Пры гэтым рэпрэзентуюцца ўсе магчымыя варыянты любові: ад неўзаемнай / хваравітай да рэалізаванай / шчаслівай. Што цікава, амаль ва ўсіх

выпадках мы можам назіраць толькі суб'ектыўныя рэакцыі лірычных герояў: аб'екты кахання пазбаўлены права голасу. Адсюль вынікае адна характэрная адметнасць: героі паэзіі маладых творцаў максімальна эгаістычныя ў праявах сваёй закаханасці.

Разглядаючы каханне як экзістэнцыйную праблему, найперш варта спыніцца на асэнсаванні творцамі самога феномена любові. У лірыцы паэтаў маладога пакалення асобнае месца належыць усведамленню кахання чалавекам мяжы XX–XXI стст., якое істотна адрозніваецца ад уяўленняў папярэднікаў. Найбольш выразным тут прадстае вобраз Амура, які бачыцца лірычнаму герою верша «Штопар» В. Жыбуля своеасаблівым вычварэнцам, вымушаным пускаць свае стрэлы з асаблівай жорсткасцю. Сённяшні чалавек нячаста здольны адчуваць па-сапраўднаму, таму «*народжанаму ў тэхнакратычную эпоху*» [8, с. 64] Амуру даводзіцца хітрыць: страла – «*закручаная штопарам / ды суздром уторканая кручкаватымі завусеніцамі*» [8, с. 64]. Аднак героі вершаў не адмаўляюцца быць закаханымі нават нягледзячы на падобныя метады боства кахання: «*Я патрабую траўня пажыццёвага / І шчасця пад пратэкцыяй Амура*» [10, с. 4] (верш «Я патрабую траўня спрэс ружовага…» Н. Кудасавай).

Яскравая рыса ўспрымання сённяшняга кахання маладымі творцамі – добра акрэсленае іранічнае стаўленне. Напрыклад, лірычны герой верша «Лёша» В. Жыбуля з непасрэднасцю апісвае магчымасць гомасэксуальнага кахання ў адказ на фемінізм [9, с. 31], што падкрэслівае адсутнасць табуяваных тэм у творчасці паэтаў і істотна адрозніваецца ад увасаблення любові паэтамі старэйшага і сярэдняга пакалення. Выразным прыкладам іранічнага модусу мастацкасці з'яўляецца таксама верш «Museo de los ninos» А. Хадановіча, дзе трапна апісваецца ўся схема інтымных стасункаў – «*love story ў коміксах*» [17, с. 53], і гэта па-экзістэнцыйнаму абсурдная магчымасць звядзення любові да загадзя вядомых дзеянняў звяртае ўвагу на тое, што сама інтымная з'ява губляе сакральнае значэнне, становіцца шаблонам. Нетрадыцыйным увасабленнем пачуццяў спрабуе шакаваць чытача Зм. Вішнёў: «*Пад чорнае піва / я разгрызу каханую*» [4, с. 75] («(садысцкія сны)»). Звяртае на сябе ўвагу тое, што толькі ў дадзенага аўтара аб'ектамі кахання становяцца такія істоты, як рыбіна, змяя і інш., тады як астатнія лірычныя героі маладых аўтараў прытрымліваюцца, калі можна так сказаць, антрапацэнтрычнага падыходу.

Каханне як феномен у сучасным соцыуме становіцца пэўным выклікам варожаму знешняму свету, «памежнаму» часу, калі навокал не застаецца нічога вартага, акрамя любові: «*грубасць гэтага горада / праступае ў запыленых вокнах / <…> мы з табой едзем / на апошніх*

*сядзеннях / з апошніх сіл учапіўшыся / пальцамі ў пальцы*» [18, с. 48] («грубасць гэтага горада…» Ю. Цімафеевай); «*Мы цалуемся ў ліфце, / які сарваўся ды падае*» [8, с. 29] («Апакаліптычная восень» В. Жыбуля); «*Наша каханне – два сэрцы, / кінутыя аб шкло*» [13, с. 38] («Балада непадзельнага» В. Рыжкова); «*У жыцці аднастайнай хронiцы / Ты падзея мая і падзенне*» [10, с. 8] («Твае вочы, як неба, сінія…» Н. Кудасавай). Цікава, што спадарожным вобразам тут часта выступае сітуацыя падзення, кінутасці, завісання ў прасторы. Неакрэсленасць самой прасторы кахання таксама характэрна для твораў маладых аўтараў, у сваіх крайніх праявах набываючы наступную фармуліроўку: «*геаграфічна неабмежаванае каханне*» [5, с. 8] («браты люм'ер…» В. Гапеевай). Аднак менавіта любоў займае эпіцэнтр усяго чалавечага існавання (вершы «на твой спрошчаны твар…» [2, с. 34] Ц. Велета, «лістападу не прывыкаць, што лісты, лісты…» [11, с. 107] Н. Кудасавай інш.), менавіта яна «*танчыць у цэнтры / замкнёнага кола*» і пакідае адзіны варыянт – «*схіліць перад ёю голаў*» [15, с. 58] («сталасць не ёсць мудрасць» В. Трэнас), менавіта яна супрацьстаіць смерці як такой: «*Але калі мы знаходзілі каханне, размазанае на мухабойцы разам з крывёй / і вантробамі мух і камароў, / мы злізвалі яго недатыкальным, / адваротным бокам свайго языка*» [12, с. 19] («Ода да Бранкі» В. Морт).

Аднак страта сучасным соцыумам веры ў магчымасць рэалізацыі кахання прыводзіць да ўзмацнення драматычнага пафасу (вершы «колькі можна было вынаходзіць квадратныя колы…» [15, с. 50] В. Трэнас; «Ад слупа да слупа» [7, с. 51], «- развагі ў дождж -» [5, с. 23] В. Гапеевай і інш.). Так, ролевая лірычная гераіня В. Гапеевай праводзіць выразную мяжу паміж псеўдакаханнем і сапраўдным пачуццём, але прыходзіць да несуцяшальнай высновы: і першае, і другое прыносіць боль: «*абяцалі каханне а выйшла / чатыры дачкі, мужык п'е і адпачывае сам на курортах / не буду нікога любіць / усё гэта бздуры для пеставаных паэтаў, пустое / ну яго…*» [5, с. 23]. Гранічны драматызм паўстае пры асэнсаванні фізічнага гвалту ў межах сям'і: у вершы «Я рыба…» Ю. Цімафеевай вобразы рыбы і жонкі рыбака зліваюцца ў адзін, бо і першая, і другая церпяць боль, але не маюць сілы яго ўнікнуць, бо грамадства ўсё яшчэ з цяжкасцю аспрэчвае абсурдную логіку «б'е – значыць любіць» і лёгка знаходзіць апраўданні, якія становяцца мантрай: «*Ніхто не вінаваты, / ён дбае пра сям'ю / сваю, / маю*» [18, с. 28].

Варыянтам выйсця ў такіх выпадках можа стаць адзінота, але лірычныя героі прызнаюцца, наколькі нежаданай яна з'яўляецца: «*страшна заставацца аднаму*» [13, с. 12]. Таму боязь адзіноты часта прыводзіць да бесперспектыўнага існавання побач, але не разам («Сто

гадоў адзіноты…» [10, с. 42] Н. Кудасавай; «Смак адчаю» [15, с. 14], «Замова» [16, с. 21] В. Трэнас і інш.), і нават можа падштурхнуць да «*катаржнай працы кахаць калі ўжо не кахаеш*» [5, с. 8] (верш «верыць у цуд на каляды – ужо непрыстойна…» В. Гапеевай). Тады магчымым зыходам становіцца «*скарміць галубам / апошнюю лусту сваёй любові*» [15, с. 13], каб пазбавіцца ад пакутлівых перажыванняў.

Аўтарамі таксама асэнсоўваецца і немагчымасць быць разам з аб'ектам свайго захаплення ў сілу шматлікіх акалічнасцей. Напрыклад, верш «Я хачу паварушыць тваім хвастом…» В. Жыбуля завяршаецца радкамі: «*Я хачу да цябе дакрануцца, але / мы жывем у розных акварыумах*» [8, с. 26]. Што цікава, такое дзеянне, як варушэнне, з'яўляецца і ў вершы «Пацука мама на ганак шама» Зм. Вішнёва: «*Я падвешу цябе як тушку труса да / бэзавай лямпачкі <…> / Заварушы Заварушы сваімі канечнасцямі*» [3, с. 146]. Маханне хвастом з'яўляецца ў вершы «п'еса "The Portrait of the Artist as a Young Bitch"» [6, с. 38] В. Гапеевай. (У Ц. Велета сустракаем: «*і мы стаім з табою не варушачы нічым*» [2, с. 48] («VI. усё пралітае з часам паглынае жвір…»), аднак цяжка дакладна сказаць, ці правамерна разглядаць гэты вобраз у рамантычным кантэкцсе.) Ва ўсіх згаданых выпадках рух можа сведчыць пра развіццё пачуцця кахання, пра дынаміку працэсу любові, якая залежыць, у першую чаргу, ад жадання закаханых змяняцца разам са сваімі перажываннямі, «варушыцца» ў накірунку да жаданага.

Шчаслівае каханне суадносіцца з найвышэйшай асалодай у жыцці чалавека, абумоўленай, па словах Ж.-П. Сартра, бачаннем Іншым тваёй Існасці [14, с. 207]. У паэзіі інтымнае пачуццё можа асэнсоўвацца як з'ява, здольная рабіць чалавека ўнікальным, калі «*мы й не падобныя адно да аднаго – / мы ручной працы*» [12, с. 74] («Утопія» В. Морт). Нездарма неад'емным вобразам любоўнай лірыкі з'яўляюцца вочы: «*ты адбіваешся ў зрэнках маіх*» [15, с. 34] (аднайменны верш В. Трэнас). Зрок набывае семантычную важкасць таксама ў вершах «Спартовая трампланаманія» [3, с. 144] Зм. Вішнёва, «Твае вочы, як неба, сінія…» [10, с. 8] Н. Кудасавай, «Замова» [16, с. 21] В. Трэнас, што цалкам суадносіцца з традыцыйным падыходам да ўвасаблення любоўных пачуццяў. Сучасны рамантычны вобраз кахання дасягае апагею ў вершы «Цэлафанавыя вятры» В. Гапеевай, дзе сцвярджаецца выключнасць каханага чалавека: «*у іхніх вачох няма нават зрэнкі / тваёй каханай*» [7, с. 33]. Сустракаецца таксама яшчэ адзін традыцыйны вобраз – увасабленне інтымных пачуццяў праз метафарычнае зліццё дзвюх душ (В. Трэнас, Н. Кудасава), хаця ў такіх выпадках часам небяспечнае жаданне знітаванасці з аб'ектам кахання пагражае знікненнем уласнага «Я», а стан залежнасці ад іншага чалавека выглядае хутчэй

добраахвотным вытанчаным рабствам: «*я твой верны сабачка / паддаюся дрэсуры*» [6, с. 38] («п’еса “The Portrait of the Artist as a Young Bitch”» В. Гапеевай).

Такім чынам, каханне як экзістэнцыйная катэгорыя ўвасабляецца ў лірыцы маладых паэтаў пераважна праз прызму драматычнага пафасу. Вітальны пачатак нярэдка ў любоўных вершах саступае эсхаталагічным матывам. Разам з каханнем аўтарскія лірычныя героі перажываюць цэлы спектр такіх пачуццяў, як страх, рэўнасць, адзінота, пакуты і пад., пры гэтым лірыка кахання пераважна эгацэнтрычная. Боязь адзіноты часта прыводзіць да бесперспектыўнага існавання побач, але не разам. Часам аўтары выкарыстоўваюць прыёмы іроніі і эпатажу, нагружаючы свае вершы смелымі вобразамі, тым самым адхіляюцца ад празмернага драматызму (В. Жыбуль, Зм. Вішнёў, А. Хадановіч, В. Гапеева). Шчаслівае каханне паўстае, як правіла, праз традыцыйныя вобразы зліцця дзвюх душ і вачэй як сімвала бачання Іншым тваёй сутнасці. Адметным уяўляецца і распаўсюджанае ў творчасці маладой генерацыі прыпадабненне стану любові да падзення, кінутасці, завісання ў прасторы (В. Жыбуль, В. Рыжкоў, Н. Кудасава). У цэлым, каханне як феномен у сучасным соцыуме разглядаецца маладой генерацыяй паэтаў у якасці пэўнага выкліку варожаму знешняму свету, «памежнаму» часу.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. Бельскі А. І. Паэзія / А. І. Бельскі // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. Т. 4. Кн. 2. Мінск : Бел. навука, 2003. С. 39–87.
2. Велет Ц. Мост : выбраныя вершы. Мінск : Логвінаў, 2007. 60 с.
3. Вішнёў Зм. Тамбурны маскіт. СПб : Невский простор, 2001. 256 с.
4. Вішнёў Зм. Фараон у заапарку : тэксты. Мінск : Логвінаў, 2007. 170 с.
5. Гапеева В. Граматыка снегу. Мінск : Галіяфы, 2017. 68 с.
6. Гапеева. Прысак і пожня. Мінск : Логвінаў, 2013. 60 с.
7. Гапеева В. Рэканструкцыя неба. Мінск : Логвінаў, 2003. 142 с.
8. Жыбуль В. Стапеліі : вершы. Мінск : Галіяфы, 2012. 220 с.
9. Жыбуль В. Дзяцел і дупло : вершы. Мінск : Галіяфы, 2016. 76 с.
10. Кудасава Н. Лісце маіх рук : паэзія. Мінск : Логвінаў, 2006. 76 с.
11. Кудасава Н. Маё невымаўля : вершы. Мінск : Кнігазбор, 2016. 116 с.
12. Морт, В. Эпідэмія ружаў / В. Морт. Мінск : Логвінаў, 2017. 100 с.
13. Рыжкоў В. Дзверы, замкнёныя на ключы. Мінск : Логвінаў, 2010. 108 с.
14. Сартр Ж.-П. Первичное отношение к другому: любовь, язык, мазохизм // Проблема человека в западной философии : переводы. М. : Прогресс, 1988. С. 207–228.
15. Трэнас В. Экзістэнцыйны пейзаж : вершы. Мінск : Галіяфы, 2008. 84 с.
16. Трэнас В. Цуд канфіскаванага дзяцінства : вершы. Мінск : Логвінаў, 2005. 94 с.
17. Хадановіч А. Цягнік Чыкага-Токіё : вершы. Мінск : Логвінаў, 2016. 182 с.
18. Цімафеева Ю. Цырк : вершы. Мінск : Выдавец Зміцер Колас, 2016. 72 с.